Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛЮТАГА 2018 г. СУБОТА № 24 (28640)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Танцы для сур'ёзных людзей у міні-спадніцы**

СТАР. 5



**«Рэвізор» загаварыў на трасянцы**

СТАР. 8



**Чаго вы не ведалі пра нашых алімпійцаў**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Віцебскай вобласці трэба сур'ёзна працаваць над павышэннем эфектыўнасці вытворчасці. За мінулы год рэгіёнам дасягнуты пэўныя станоўчыя вынікі: валавы рэгіянальны прадукт — 101,3 %, ёсць рост у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Вялікая ўразлівасць Віцебшчыны ў тым, што ў вобласці нізкая эфектыўнасць вытворчасці, нізкі ўзровень заработнай платы. Таму асноўную ўвагу трэба ўдзяліць пытанням павышэння эфектыўнасці і зніжэння выдаткаў. У рэгіёне зараз многае робіцца ў АПК: будуюцца сучасныя МТФ, створаны аграхолдынгі. Віцебскія кадры разумеюць задачы, ёсць добры вопыт многіх пакаленняў. Важна гэта ўсё захаваць і прымнажаць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9744 | ▼ |
| Еўра | 2,4667 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0351 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Абрус са Святога



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Святое Жлобінскага раёна зімаваць застаецца няшмат жыхароў. Адна з тых, хто ніколі не пакідае сваю малую радзіму, — Зінаіда КУТОЎСКАЯ, старэйшына вёскі. У доўгія зімовыя вечары Зінаіда Мікалаеўна бавіць час за сваім улюбёным заняткам — вышыўкай абрусаў і ручнікоў.

■ Разумныя грошы

## БЕЗНАЯЎНЫ РАЗЛІК... ДЛЯ ЖОНКІ

Чаму мець шмат плацежных картак не заўсёды разумна

**Я, як, напэўна, і многія жанатыя мужчыны, амаль усе заробленыя грошы аддаю сваёй другой палове. Не, яна ў мяне не гультай, проста я, у адрозненне ад яе, не люблю хадзіць па крамах. Пастаянна здымаць са свайго пластыку буйныя сумы грошай і перадаваць іх жонцы — неяк не па-сучаснаму атрымліваецца. Выйсце — аформіць другую картку да свайго банкаўскага рахунку. Потым яшчэ адну і яшчэ... А абслугоўванне пластыку таксама каштуе грошай. У чым жа асаблівасці дадатковай карткі і ці адрозніваецца яе кошт ад асноўнай?**

### Бюджэтны варыянт

У самым пачатку сваіх сталых зносін з фінансамі вызначаем, што для аплаты паслуг і пакупак мы адкрываем разліковы рахунак і, як правіла, выпускаем асноўную картку (усё роўна, асабістую або зарплатную). Да гэтага рахунку амаль ва ўсіх выпадках можна замовіць дадатковую картку, каб хто-небудзь з членаў вашай сям'і мог карыстацца грашовымі сродкамі нароўні з вамі.

Калі вы хочаце аформіць дадатковую картку да свайго зарплатнага рахунку, то неабходна звярнуцца ў банк, паведаміць назву сваёй арганізацыі, зарплатнага праекта і тып карткі. Супрацоўнікі банка падкажуць, колькі будзе каштаваць менавіта ў вашым выпадку другая картка, а калі яна ўваходзіць у пакет паслуг — плаціць за яе не прыйдзецца. Таксама яна будзе бясплатнай, калі да свайго разліковага рахунку вы закажаце дадаткова ў Беларусбанку самую простую картку Белкарт-Стандарт.

СТАР. 4

■ Спажывец

## ПАЛІТО ПА ЦАНЕ АЎТО

Ці карыстаюцца попытам футры ў анамальна цёплую зіму?

**Калі хто памятае, навукоўцы прадказвалі, што гэтая зіма стане самай халоднай за апошнія сто гадоў. Пакуль прагноз не спраўдзіўся. Снежань і студзень ставілі тэмпературныя рэкорды — са знакам плюс. Для прадаўцоў футраў гэта, хутчэй, мінус. Як надвор'е паўплывала на попыт на іх тавар і хто з беларусаў можа дазволіць сабе норкавыя паліто — у нашым рэпартажы.**

СТАР. 7



На рынку — тавары з Расіі, Грэцыі і Кітая.